# Саюз слова і фарбаў

## Мастачка Дзіяна Каласовіч стварыла шэраг ілюстрацый да краязнаўчых кніг

**Сёння ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў межах XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу адбудзецца адкрыццё выстаўкі-прэзентацыі жывапісных твораў Дзіяны Каласовіч «Чырвоны радок», напісаных у якасці ілюстрацый да краязнаўчых кніг Алеся Карлюкевіча. Мерапрыемства падрыхтавана сумесна з Беларускім фондам культуры і Выдавецкім домам «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**



*Дзіяна Каласовіч. «Дукора. Мацярынскае возера», 2017 г.*

Экспазіцыю складаюць дваццаць тры жывапісныя творы, выкананыя ў аўтарскай тэхніцы алейнымі фарбамі. Кожная з прадстаўленых работ створана падчас пленэраў па Мінскай вобласці і адлюстроўвае «літаратурныя адрасы» Любанскага, Салігорскага, Мінскага раёнаў.

— Для мяне гэта своеасаблівы эксперымент, бо цікава атрымліваць новыя веды, — расказвае Дзіяна Каласовіч. — Гэты праект дапамог зразумець, што ў Беларусі безліч унікальных, прыгожых мясцін, з якімі многія з нас яшчэ не знаёмыя. Таму было важна перадаць дасканаласць, гармонію краявідаў. Можа, хто-небудзь таксама натхніцца і захоча ўбачыць гэтыя пейзажы на ўласныя вочы.

Творы мастачкі не проста лірычныя альбо спакойныя. Адлюстроўваючы прыгажосць краіны, творца спрабуе захапіць колерам, глыбінёй, своеасаблівай філасофіяй кампазіцыі. Па меркаванні Дзіяны, саюз слова і каляровых фарбаў спрыяе знаёмству з імёнамі, характарамі і месцамі, якія адлюстроўваюць літаратурную спадчыну.

— Нам увогуле цікавая тэма гісторыі культуры беларускіх рэгіёнаў, тым больш што выстаўка адбываецца ў Год малой радзімы, — падкрэслівае дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Павел Сапоцька. — Мы плануем зрабіць цыкл мерапрыемстваў. Выстаўка і прэзентацыя — частка праграмы «Праз літаратуру і мастацтва да міру і стварэння». Мясціны, якія мастачка апявае ў творах, маюць багатую літаратурную спадчыну. Выстаўка атрымалася мастацкай, літаратурнай і краязнаўчай адначасова.

У чэрвені 2017 года ў Дзіяны Каласовіч адбылася першая персанальная выстаўка, якая выклікала рэзананс. Работы аўтара захапілі гледачоў унікальным спалучэннем колераў і глыбінёй. З таго часу аўтар шмат працуе над рознымі праектамі. А выстаўка «Чырвоны радок» — пацвярджэнне яе працаздольнасці і ўпартасці. За кожны свой поспех мастачка дзякуе дарагому выкладчыку Яўгену Смунёву, у майстэрні якога спазнала шмат творчых таямніц.

**Вікторыя АСКЕРА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ